



# Сімвал сяброўства

Упершыню за гісторыю двухбаковых адносін у нашай краіне з 24 па 27 кастрычніка прайшлі Дні культуры Кыргызскай Рэспублікі. Замежную дэлегацыю ўзначальвала намеснік міністра культуры, інфармацыі, спорту і маладзёжнай палітыкі Гульбара Абдыкалыкава.

Шматлікія мерапрыемствы далі магчымасць гледачам убачыць традыцыйнае і сучаснае мастацтва сяброўскай дзяржавы, а гасцям — бліжэй пазнаёміцца з нашай рэспублікай. Важным складальнікам стала сустрэча, якая сабрала за круглым сталом творчую інтэлігенцыю дзвюх краін.

## ВЫТАНЧАНЫ КАЛАРЫТ

Дні культуры стартавалі выставай твораў членаў Саюза мастакоў Кыргызскай Рэспублікі ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Экспанавалася 30 жывапісных палотнаў, якія адлюстроўвалі народныя матывы, гістарычную памяць, прыгажосць прыроды і раскрывалі тэму традыцый, укладу жыцця, светаўспрымання самабытнага кыргызскага народа.

Вітаў удзельнікаў урачыстасці першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерый Грамада. Ён адзначыў, што Дні культуры Кыргызскай Рэспублікі — знакавая падзея. У мінулым годзе ўпершыню адбыліся Дні культуры Беларусі ў Кыргызстане. Такі культурны абмен сведчыць аб імкненні нашых краін да супрацоўніцтва ў розных сферах.



Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кыргызскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Эрбол Султанбаеў падкрэсліў, што культурна-гуманітарнае ўзаемадзеянне разам з гандлёва-эканамічным супрацоўніцтвам з'яўляецца тым слупам, на якім у цэлым трымаюцца адносіны паміж краінамі. І сёння здзяйсняецца прарыў у культурным кірунку.

— Дні культуры — гэта не толькі абмен культурнымі дасягненнямі, але і сімвал сяброўства паміж дзяржавамі, — дадала намеснік міністра культуры, інфармацыі, спорту і маладзёжнай палітыкі Кыргызскай Рэспублікі Гульбара Абдыкалыкава. — Нашы краіны даўно супрацоўнічаюць на розных міжнародных пляцоўках, такіх як СНД і ШАС, і культурныя абмены займаюць у гэтым працэсе асаблівае месца — спрыяюць яшчэ большаму збліжэнню народаў, узбагачаючы нас узаемаразуменнем.

Як знак павагі да беларускага народа і пацвярджэння высокіх дружалюбных адносін Нацыянальнаму мастацкаму музею была падорана карціна народнага мастака Кыргызскай Рэспублікі Таалайбека Усубаліева "Тактагон Алтыбасарава з дзецьмі з блакаднага Ленінграда, 1942".

## АБ ВЕЧНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ

Падчас Дзён кыргызскага кіно мінчанам і гасцям сталіцы прапанавалі пяць фільмаў.

— Наш глядач знаёмы з творчасцю кыргызскіх кінематаграфістаў дзякуючы іх удзелу ў Мінскім міжнародным кінафестывалі "Лістапад". Нягледзячы на рознасць менталітэтаў і культур, кыргызскае кіно блізкае і зразумелае беларусам, паколькі расказвае пра вечныя каштоўнасці: вернасць традыцыям, павагу да продкаў і бацькоў, любоў да роднай зямлі, — заўважыў першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерый Грамада.

Прадстаўнікі Кыргызскай Рэспублікі падкрэслілі значэнне кіно як унікальнай платформы для міжнароднага культурнага абмену. Пакуль у галіне кінавытворчасці дзвюх нашых краін не было ніводнага сумеснага праекта. Але такія мерапрыемствы, як абменныя Дні культуры і Дні кіно, безумоўна, пакладуць пачатак плённаму супрацоўніцтву.

## БЕЗ ФАРМАЛІЗМУ

Прадуктыўна прайшоў пад кіраўніцтвам міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча круглы стол у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, прысвечаны ролі культуры і навукі ва ўмацаванні міждзяржаўных адносін. Анатолій Маркевіч падкрэсліў, што аднаўленню культурнага абмену мы абавязаны перш за ўсё добрым адносінам і шчыраму сяброўству кіраўнікоў дзяржаў — Аляксандра Лукашэнкі і Садыра Жапарава. Прыезд прадстаўнічай кыргызскай дэлегацыі дзеячаў культуры і мастацтва міністр культуры назваў гістарычнай падзеяй. Двухбаковым кантактам наша краіна надае важнае значэнне. І Дні культуры — дзейсная форма культурнага дыялогу.

— Ужо намечаны перспектывы супрацоўніцтва ў галіне арганізацыі абменных выставак, пракату фільмаў і правядзення Дзён беларускага кіно ў Кыргызстане, — паведаміў Анатолій Маркевіч. Ён выказаў упэўненасць, што спектр узаемавыгадных кантактаў пашырыцца і ахопіць тэатральнае і музычнае мастацтва, фільмавытворчасць, музейную і бібліятэчную справы і сферу адукацыі. Падкрэсліў: нягледзячы на тое, што нашы краіны аддзяляюць тысячы кіламетраў, у духоўным свеце беларусаў і кыргызаў шмат агульнага: абвостранае пачуццё патрыятызму і гонару за ўласную гісторыю, фундаментальныя паняцці, на якіх заснаваны нацыянальны менталітэт і беларусаў, і кыргызаў, — моцная сям'я, павага да старых, клопат аб дзецях.

— У нашых культурных узаемаадносінах была паўза, і мы павінны абавязкова запоўніць прабелы. Для гэтых мэт у нас ёсць усё неабходнае: прафесіяналы, добрая воля, жаданне працаваць разам. Мы змацавалі свае намеры дакладнымі, зразумелымі дакументамі, якія будуць дапрацаваны на ўзроўні двух міністэрстваў. Дарожная карта, якая з'явіцца, дазволіць сістэмна рухацца да пастаўленых мэт — абмену культурнымі традыцыямі, напрацоўкамі, знаёмстваў з нашымі калектывамі, — адзначыў міністр культуры Рэспублікі Беларусь.

## ЯРКІЯ МОМАНТЫ

У рамках Дзён культуры Кыргызскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтва прайшла сустрэча з удзелам першага намесніка Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерыя Грамады, намесніка Міністра культуры, інфармацыі, спорту і маладзёжнай палітыкі Кыргызскай Рэспублікі Гульбары Абдыкалыкавай і рэктара ўстановы Наталлі Карчэўскай. Прадстаўнікі кыргызскай дэлегацыі наведалі Бабруйскі мастацкі музей, Бабруйскі краязнаўчы музей, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, а таксама пазнаёміліся з гістарычнай спадчынай нашай краіны ў Замкавым комплексе "Мір" і Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку "Нясвіж".

На сцэне Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча (г. Бабруйск) з аншлагам прайшоў канцэрт майстроў мастацтваў Кыргызскай Рэспублікі. А вянцом Дзён культуры дружалюбнай краіны стаў гала-канцэрт кыргызскіх майстроў мастацтваў у Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Перад яго пачаткам можна было пазнаёміцца з работамі кыргызскіх рамеснікаў — іх выстава стала цікавай часткай мерапрыемства.

**Святлана ЧЭКАЛАВА**
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

1. Эрбол Султанбаеў і Гульбара Абдыкалыкава.
2. Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч, народны мастак Кыргызскай Рэспублікі Таалайбек Усубаліеў і генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Ганна Конанава.
3. Падчас гала-канцэрта ў Белдзяржфілармоніі.